во“—гэта едзіная нацiональная газэта, а „Минск. Слово“—толькі „так сабе“. Ізноў жэ п. Солоневіч не на жыцьцё, а на сьмерць счапіўся з „Виленск. Вѣстникомъ“ за тые 12,000 руб., каторые яму прэць у вочы „В. В.“, ды за нейкаго графомана графа Корвін-Мілевскаго. Так лаюцца, а глаўнае пэрэходзяць на асобы, што неяк прыпамінае романс англійскаго пісара Діккенса „Запіскі Піквікскаго клуба“: там раскасываецца, як у заездзі спаткаліся прыпадкам рэдактары двух газэт, каторые вечна ваевалі між сабой, і тут яны счапіліся.— „Бацькоўбіўца, зменнік, кандыдат у катаргу, вісельнік!.“—гэтак пачалі яны адзінаднаго чысьціць; тады вялікі насьмешнік, лёкай Самуэль Уалер, пастрашыў іх, што, калі яны зараз жэ не заціхнуць, дык ён звяжэ іх разам і паложыць на-ноч у адно ложка..

Грызіцеся, паны, калі гэтак вам ужо лішне хочэцца, на тое ваша воля! Але толькі аб другіх ня лжыце! Бо вось у № 1471 і 1476 (1912 г.) „Минск. Слово“ напісало „заведому“ брэхню, бытцым рэдакцыя „Нашай Нівы“ у справі шрыфту кажэ, што яна сама *стаіць за польскіе літэры і хочэ друкаваць газэту ў польскай мове...* ды што „Наша Ніва“ вустамі нейкаго ксендза з радасьцю абвесьціла, што скора ўвесь наш край стане польскім!...

Такая брэхня—гэта ўжо не „хлестакоўшчына“, а проста „*хуліганшчына*“.

## Зембінскі хаўрусны банчок.

22 студня было агульнае сабраньне нашаго банчка (хаўруса дробнаго паверу). Аткрыў сабраньне прэдседацель суполкі Броніcь Рава, просячы выбраць на гэта заседаньне прэдседацеля, у адзін голас выбралі у прэдседацелі Антона Батуру, інспэктара хаўрусоў дробнаго паверу, каторы сумысьля прыехаў на гэта сабраньне, а на сэкрэтара супольніка Шаўчана.

На сабраньне прыбыло чуцьчуць супольнікоў, усіх супольнікоў сабралося 115 чэлавек, у тым чысьле члены праўленьня і рады. З гадавога атчоту відаць, што Зембінскі хаўрус дробнаго паверу разшыраецца с кожным годам, летась было 715 чэлавек супольнікоў, а сёлета прыбыло 423 чэлавекі і цяпер усіх супольнікоў 1138 чэлавек; гатоўкі, аснаўнога капіталу летась было 2,520 рублёў—запаснога 135 руб., сёлета аснаўнаго 2,940 руб., запаснаго 250 руб.; укладоў летась было 13,870 руб., сёлета 26,559 рублёў, кароткасрочнаго доўгу у Гасударственным Банку летась было 2,000 руб., сёлета німа ніякаго доўгу. У Нова-Барысаўскім Банку суполка мае разам с працэнтамі 5,708 руб. сваіх укладоў; суполка купіла акцію Маскоўскаго Народнаго Банку за 250 руб.; меньня свайго суполка мае на 111 руб.; пазычэк суполка летась выдала на 12,500 руб., сёлета-ж на 25,000 руб; прасрочэных пазычэк гэта значыць такіх супольнікоў, каторые у тэрмін не плацяць суполка, дзякаваць Богу, не маець, за тры гады была выслана толькі адна жоўтая павестка аб адміністрацыйным узысканьню; чысты даход летась быў 572 р. 42 кап., сёлета 1,590 руб 27 кап.

Сабраньне прыступіло да раздзелу чыстаго даходу, па закону 40 працэнтоў, гэта значыць 636 р. адыйшло у супольніцкі капітал, палавіна гэтай сумы 318 руб. у запасны капітал, апошніе-ж 636 р. сабраньне пастанавіло раздзяліць гэткім парадкам: 300 р. у капітал на куплю меньня (суполка думае с часам купіць свой дом у Зембіне); 150 рублёў у капітал асобнаго назначэньня гэта значыць у капітал на чорную гадзіну; далей 180 руб. было празначэно на куплю падарка супольніку Раве. Тут трэба ведаць, што супольнік Рава улажыў усё сваё сэрцэ і душу у зембінскую суполку дробнаго паверу, служыць і працуець дарма, дык думка была падхвачэна воклaскамі усяго сабраньня, чатыры раза Рава атказываўся ад падарка, кажучы, што для яго самы лепшы падарак гэта калі хаўрусьнікі будуць вельмі акуратна у тэрмін выплачываць пазычэные грошы, каб ня трэба было высылаць жоўтых павестак, і што шкада гэтых 180 р. на падарак, а лепей будзе як яны астануцца у суполцы. доўга аб гэтым гаварылі; гаварылі Батура, Рава, Шаўман, Русак, Свянціцкі, Бэрлін, Цюндзевіцкі, Жуковіч і другіе і наканец змяк наш прэдседацель Рава і прыняў на памяць ад суполкі падарак. далей пастаноўлена было апошніе 6 р. 27 кап. далічыць да чыстаго даходу на 1912 год.

Пасьля агульнае сабраньне пастанавіло выдаваць пазычкі да 1,000 руб. зембінскай гаспадарскай суполцы на куплю гаспадарскіх машын і прылад.

Агульнае сабраньне пастанавіло так жэ у адзін голас, супольніку Тодару Швайбовічу пазычыўшаму 20 руб., і каторы нідаўна у шчэнт згарэў, дараваць гэту пазычку. Пасьля прыступілі да выбару членоў праўленьня і рады на места выступаючых па чэрадзе членоў праўленьня Яроша і Жуковіча і членоў рады Шаўмана і Станкевіча; усіх гэтых самых выбралі у адзін голас ешчэ на тры гады.

Затым сабраньне прыступіло да прагляду праекту расходоў і даходоў на 1912 год. Пастанавілі: на кватэру 120 руб.; пэнсіі старшаму касіру Міхасю Ліхадзееўскаму 100 руб. і членам праўленьня за кожнае заседаньне па адным рублю; на расходы канцэлярскіе, пачтовые і другіе пазволіць праўленьню выдаваць сколькі трэба будзе; пазволіць праўленьню пазычаць сколькі і калі трэба будзе грошы у гасударственным банку, а такжэ і у прыватных людзей. Пастанавілі уклады прынімаць ад аднаго чэлавека ня меней рубля і ня болей 3 тысяч рублёў; працэнт устанавілі для безтэрміновых укладоў $4^{1/2}$ працэнты, а на тэрміновые 5 працэнтоў. Дагэтуль за пазычку плацілі 10 працэнтоў, цяпер пастаноўлено браць толькі 9 працэнтоў. Дзеля гэтаго каб сабраць агульнае сабраньне і каб яно было законнае, пры цяперашнім чысле супольнікоў, трэба сабраць сотню супольнікоў, што зрабіць цяжка, бо кожны, калі не мае патрэбы сам і жывучы пры тым за 30 вёрст ад Зембіна ня дужа ахвотна яўляецца, дык было пастаноўлена дзеля лягчэйшаго склікання агульнаго сабраньня выбраць упоўнамочэнных, разбіўшы супольнікоў на группы, ня больш 300 чэлавек у кожную группу, а упоўнамочэных выбраць ад 30 да 100 чэлавек.

Летась на агульным сабраньні было пастаноўлена прынімаць у супольнікі і жыдоў рэмесьнікоў і прамыслоўцоў, але для іх, каб пазычыць грошы трэба было выстарацца двох паручыцелёў, прычым адзін з іх павінен быў быць хрысціянінам, сёлета на агульным сабраньні супольнік Файн, падняў гэту справу і прасіў. каб і для жыдоў супольнікоў быў так сама адзін паручыцель; сам прэдседацель сабраньня, інспэктар Батура, усе супольнікі жыды, а такжэ супольнікі хрысьціяне падтрымалі гэту справу, але член рады, земскі начальнік Шаўман, даводзіў у сваей мове, што жыд супольнік найчасьцей узяўшы грошы або дасць цягу у Амэрыку, або зробіць круцельство і перапішэць сваё меньне на жонку і дзяцей і трэба будзе паісківаць, дык пры галасаваньні выказалося, што і ў гэтым гаду жыдам супольнікам трэба будзе шукаць другога паручыцеля, гэта не справядліва тым больш, што, як вядома, у нас паручыцелі у поўкварты заглядаюць. А што да гарэлкі, як мне ня стыдна аб гэтым пісаць, але я сам чуў выходзячы с сабраньня, як некаторые нашы супольнікі хрысціяне казалі да жыдоў „трэба было узяць вядро гарэлкі, быў бы адзін паручыцель“—дужа стыдна, што паміж нас ёсць такіе гаспадары грамадзяне, ці то у суполцы, ці то у воласьці, толькі думаюць аб чарцы і за чарку гатовы усё зрабіць, а каб паслужыць грамадзянскай справе і без чаркі не разумеюць і ня хочуць разумець.

Дзеля таго, што зембінская суполка дробнаго паверу ёсць членам Маскоўскаго Народнаго Банка, бо ужо маець акцію гэтаго банку, трэба было выбраць дэлегата (упоўнамочэнаго) у гэты банк каб паддзержываў справы Зембінскай суполкі; былі намечэны два кандыдаты: Броніслаў Рава і Болесь Сьвянціцкі, першы атказаўся, другі і прыняў упоўнамочэньне, прычым усе расходы на паездку у Маскву прыняў на свой кошт.

Наканец сэкрэтар Шаўман прачытаў пратакол заседаньня каторы падпісалі усе сабраўшыеся супольнікі.

Трэба тут аддаць справядлівасць нашаму праўленьню і радзе, што яны добра працуюць і крэпка атданы добрай справе: два гады дарма працавалі, летась некаторые бралі па 50 кап. за кожнае заседаньне і я тут не хібну, і ніводзін супольнік напэўна ня будзе праціўен, калі ад імені усіх супольнікоў Кішчына-Слабодзкай і Зембінскай валасьцей прынясу членам праўленьня і рады: Раве, Сьвянціцкаму, Шаўману, Станкевічу, Ярошу, Ліходзееўскому, Жуковічу, Белабоцкаму, Кротовічу вялікае дзякуй, але найбольш працы, найбольш часу, найбольш палюбілі нашу суполку дробнаго паверу прэдседацель Рава, каторы стаіць у галаве усей суполкі і касір Міхась Ліхадзееўскі і ім ешчэ раз дзякуем, дай Бог такіх людзей болей і с такіх людзей мы павінны браць прыклад, а не с такіх каторые за чарку і толькі за праклятую чарку гатовы што нібудзь, а нават і ўсё зрабіць.

*Супольнік.*

* * *

Гудзіць вецер, завывае
Стогне—плачэ ў полі;
А на сэрцы так тужліва,
Жаль мінуўшай долі...

І пад енк тых страшных тоноў
Душа замірае:
Хтось жывы, здаецца, плачэ
Стогнучы канае.

І, так цяжка тады жыці,
Ў сэрцу столькі болю,—
І ляцела б я, здаецца,
З ветрам гдзесь у поле!

Маладых дзён усе мары,
І тое, што згубіла,
І за чым душа так тужыць
Я-б тады забыла.

І ў шырокім-бы прасторы
З ветрам я летала,
Дзён мінуўшых, дзён шчасьлівых
Я-бы пашукала.

*В. Станкевічанка.*

2)

# Гутаркі с чытачамі.

### Які шрыфт? *)

Як мы ўжо пісалі, прыхільнікі рускаго шрыфту проста *дамагаюцца* яго. А каб-жэ не было на іх ніякіх напасьцей, што „от, так сабе выдумалі і дамагаюцца“,—дык выстаўляюць у сваіх лістах вельмі сур'ёзные аргумэнты, каторымі шмат людзей могуць пэрэканаць ды прыцягнуць на свой бок. Вось, хаця-бы ўзяць пагляды нашаго песьняра Я. Купалы, каторы, як прыхільнік аднаго шрыфту ў беларускім друкаваным слове, глядзіць на гэту справу так:

„Ёсць адзін вялікі Беларускі край, адзін многамільённы беларускі народ; адна у гэтаго народу беларуская мова, і ўсяго гэтаго свая-ж кніжка ня мае права дзяліць на дзьве палавіны—на каталікоў і праваслаўных, як тое рабіла дагэтуль рэлігія і чаму можэ дапамагаць друкаванае роднае слова двума шрыфтамі“.

Пасьля Я. Купала тлумачыць, што „шрыфт рускі не перэіначыць (як некаторые думаюць) нацiональнай беларускай душы, як не перэіначыло яе колькіяковае ўладарства прэдстаўнікоў іншых культур. Беларус астанецца беларусам, як асталіся балгары—балгарамі, сэрбы—сэрбамі і украінцы—украінцамі, хаця і друкуюць свае кніжкі так званай „гражданкай“. Апроч таго Купала звертае увагу прыхільнікоў лацінскіх літэр, каторые зсылаюцца на вышэйшасць заходняй культуры перэд усходняй, што „*культуру ня шрыфт творыць, а ідэі*, якіе сеюцца ў народзе друкаваным словам; і *ня шрыфт загараджывае дарогу беларусам да ўсесьветнай культуры*, а тые роднай зямлі сыны, каторые утапілі і топяць свае беларускіе душы толькі у хвалях Віслы або Волгі“.

На самым канцы Купала дае гарачы атказ усім тым, што сягоньня робяць нашаму народу бытцым ласку, чытаючы беларускую кніжку, друкаваную тымі або іншымі літэрамі, і вырэкуцца гэтай кніжкі, калі яна будзе друкавана адным шрыфтам: „Такіе чытачы далёка беларусоў не завядуць. Беларусам патрэбны беларусы, а не палітычные гешэфтмахеры, каторые пры першым лепшым падмуху з заходу ці з усходу хіляюцца да Варшавы, або да Масквы“.

„Такім парадкам—пішэ далей Купала,—абдумаўшы ўсё, як мне сумленьне дыхтавало, і прыймаючы пад увагу, што ў нашым краю бадай кожны граматны знае рускіе літэры, а не лацінскіе,—я і прылучаюся да прыхільнікоў аднаго шрыфту ў беларускім друкаваным слове і падаю свой голас за тые літэры, якімі суджэна было друкавацца першай беларускай сьвецкай кніжцы.—Статуту Літоўскаму“ **)

Аутар другога лісту, М. Бобр-іч, ешчэ шырэй ставіць гэтае пытаньне, на каторае паводлуг яго двух атказоў ня можэ нават быць: „Дзіўна мне і вельмі, вельмі сумна робіцца, што ёсць ешчэ людзі, каторые маюць такую арыгінальную любоў да лацінскаго шрыфту. Гэта-ж яны, відаць, адрэкаюцца ад традыцій мінуўшчыны сваей бацькоўшчыны, ад таго шрыфту, якім пісалі нашы слаўные князі часоў нацiональнай незалежнасьці, якой ужываў урад Вялікаго Княжэства Літоўска-Беларуск, якой карысталіся даўней усе, не адрокшыеся ад свайго народу“.

„І так усе нашы традыціі, уся нацiональная сьвятасць, ўсё, што павінен любіць кожны беларус, дастойны гэтаго імяні,—усё тое кажэ, што рускі шрыфт для нас глыбока родны, бо гэта адзін з нашых найдаражэйшых скарбоў, які нам нашы бацькі пакінулі разам з роднаю моваю і які мы павінны сьцерагчы і цаніць. На якіе-ж традыціі, на што ў нашай нацiональнай слаўнай мінуўшчыне могуць зыслацца прыхільнікі лацінскіх

*) Глядзі № 4 „Н. Н.“.

**) „Статут Літоўскі“ па беларуску друкаваўся рускімі літэрамі.

